# Мінсувязі выпускае ў абарачэнне паштовы блок «Сумесны выпуск Беларусі і Расіі»

13 мая 2023 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне паштовы блок «Сумесны выпуск Беларусі і Расіі. 150 гадоў з дня нараджэння Станіслава Жукоўскага».

Дызайн Алены Мядзведзь.

Блок друкаваўся ў РУП «Бабруйская ўзбуйненая друкарня імя А.Ц. Непагодзіна».

Аддрукаваны таксама без перфарацыі.

Жукоўскі Станіслаў Юльянавіч (13.05.1873, в. Ендрыхаўцы Гродзенскай губерні Расійскай імперыі (цяпер аг. Ендрыхаўцы Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл.) – жнівень 1944) – знакаміты жывапісец-пейзажыст.

Усе палотны Жукоўскага напісаны з натуры. У яго працах шмат святла і паветра, пісаў яркімі, насычанымі фарбамі, выкарыстоўваў імпрэсіяністскія прыёмы, каб зрабіць свае палотны больш лірычнымі. Асобнай важнай тэмай у творчасці Станіслава Жукоўскага былі старажытныя сядзібы.

Ён шмат падарожнічаў, малюючы паркі, будынкі, куткі інтэр'ераў з «вінтажнай» мэбляй і адчыненыя ў сад вокны.

У дзень выпуску паштовага блока ў абарачэнне на паштамце Мінска будзе праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/10-05-2023-8443*